ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
29
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 4 (1304)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

# РАПАРТ

## КАЛЕКТЫВУ БДУ імя У. І. ЛЕНІНА

## XXIX З'ЕЗДУ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

З гонарам за нашу Савецкую Радзіму, родную Камуністычную партыю ўвесь калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна сустрэў вестку аб скліканні XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і XXIX з'езда Кампартыі Беларусі.

Здзяйсняючы гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, у адказ на бацькоўскі клопат ЦК КПБ і ўрада рэспублікі аб развіцці БДУ імя У. І. Леніна вучоныя, студэнты і аспіранты, рабочыя і служачыя ў выніку вялікай арганізатарскай і палітычнай работы рэктарата, парткома, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый дабіліся значных поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, значна расшырылі фронт навуковых даследаванняў, павысілі эфектыўнасць укаранення дасягненняў навукі ў вытворчасць.

За гады дзесятай пяцігодкі падрыхтавана больш 14 тысяч маладых спецыялістаў, якія плённа працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, асветы і культуры; абаронена 12 доктарскіх і 249 кандыдацкіх дысертацый; выдадзены 364 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.

Прайшоўшыя гады з'явіліся для універсітэта важным этапам у развіцці навукі. Агульны аб'ём навуковых даследаванняў склаў у дзесятай пяцігодцы 49 мільёнаў рублёў, у тым ліку па гаспадарчых дагаворах — 37 мільёнаў рублёў. Гэта ў два з палавінай раза больш, чым за гады дзевятай пяцігодкі.

Эканамічны эфект ад укаранення навукова - даследчых работ у 1980 годзе дасягнуў 22,3 мільёна рублёў, што ў чатыры разы перавышае вынікі 1976 года.

Важкі ўклад унеслі вучоныя універсітэта ў развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Упершыню ў гісторыі ВНУ рэспублікі зарэгістравана адкрыццё (1979 г.) у галіне нейтроннай фізікі. Атрыманы 4 патэнты, 14 рэспубліканскіх прэмій, 104 медалі і дыпломы ВДНГ СССР і ВДНГ БССР, 632 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы. Дзве навуковыя работы ў 1980 годзе ўдастоены прэмій Ленінскага камсамола Беларусі.

Актыўны ўдзел у даследаваннях прымаюць студэнты універсітэта. Больш 1200 іх навуковых работ адзначаны на ўсесаюзных і рэспубліканскіх аглядах і конкурсах.

Кіруючыся запаветамі У. І. Леніна, юнакі і дзяўчаты універсітэта паспяховую вучобу спалучаюць з актыўным удзелам у грамадска карыснай працы. У студэнцкім будаўнічым руху за гады дзесятай пяцігодкі прыняло ўдзел больш 12 тысяч чалавек. Імі асвоена 32 мільёны рублёў капіталаўкладанняў. Толькі ў 1980 годзе зводны студэнцкі будаўнічы атрад асвоіў каля 10 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, здаў у эксплуатацыю 92 аб'екты, 28 з якіх са студэнцкім знакам якасці. Пабудаваны і рэстаўрыраваны 73 помнікі і абеліскі, прачытана звыш 1700 лекцый, дадзена больш 1000 канцэртаў.

Ідучы насустрач XXVI з'езду КПСС, калектыў універсітэта прыняў на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, якія паспяхова выканаў.

Выкладчыкі і студэнты, рабочыя і служачыя універсітэта ў абстаноўцы высокага палітычнага і працоўнага ўздыму шырока абмеркавалі і аднадушна адобрылі праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года».

Горача вітаючы дэлегатаў XXIX з'езда Камуністычнай партыі Беларусі, мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт КПБ і ўрад рэспублікі, што прыкладзём усе сілы, веды і вопыт, каб здзейсніць гістарычныя рашэнні Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

ЦК ЛКСМ Малдавіі і савета калгасаў Малдаўскай ССР уручыў камандзір рэспубліканскага штаба СБА ЦК ЛКСМ Малдавіі Р. І. Тарноўскі зводнаму студэнцкаму атраду БДУ, які працаваў летам мінулага года ў калгасе імя К. Маркса Слабадзейскага раёна Малдаўскай ССР.

Камсамольская арганізацыя універсітэта атрымала пераходны Чырвоны вымпел Слабадзейскага РК КПМ, савета калгасаў і РК ЛКСММ за найбольшы ўклад у выкананне народнагаспадарчых планаў раёна ў 1980 годзе і першае месца сярод камсамольскіх арганізацый ВНУ, фарміруючых атрады ў Малдавію. Вялікая група студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта атрымала Ганаровыя граматы ЦК ЛКСМ Малдавіі.

А. ШЫБУТ,
начальнік штаба
працоўных спраў БДУ.

### ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ

па адзінай сістэме вядзення праграмнай дакументацыі упершыню ў БДУ арганізаваны для студэнтаў — выпускнікоў факультэта прыкладной матэматыкі. Справаздачы аб практыцы і дыпломныя работы павінны быць аформлены адпаведна патрабаванням стандартызацыі, аб якіх расказаў пяцікурснікам факультэта загадчык аддзела ЦНДІТК В. В. Бацечка.

А. ЗМІТРОВІЧ.

### НАРАДА КУРАТАРАЎ

усіх акадэмічных груп дзённага аддзялення, на якой абмяркоўваўся ход зімовай сесіі, адбылася на хімічным факультэце. Аб правядзенні работы па прафесійнай арыентацыі студэнтамі хімфака ў час зімовых канікулаў выступіў намеснік дэкана факультэта В. В. Самахвал.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

### ПЕРАД ШКОЛЬНІКАМІ

горада Пінска з цікавымі і змястоўнымі лекцыямі аб БДУ — старэйшай навучальнай установе рэспублікі выступіў загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі А. С. Кляўчэня. Больш за 750 выпускнікоў 12 школ горада даведаліся аб гісторыі і дасягненнях універсітэта, аб прафесіях, якія можна атрымаць на нашых факультэтах.

А. ГЕРМАНОВІЧ.

«ПАДРЫХТАВАЦЬ ПРЫКЛАДНА 10 МІЛЬЁНАЎ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ З ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫЯЙ. АЖЫЦЦЯВІЦЬ МЕРЫ ПА ПАВЫШЭННЮ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ І ПАЛЯПШЭННЮ ІХ ВЫКАРЫСТАННЯ Ў НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ».
*(З ПРАЕКТА ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ).*



Студэнткі І курса мехмата ГУД Ларыса і ЕЛІСЕЕВА Ала перад здачай экзаменаў па алгебры.
Фота **М. Дубовіка.**

## ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ

У АБМЕРКАВАННІ праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі прыняў удзел увесь калектыў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі БДУ. З дакладам аб асноўных напрамках развіцця краіны на сходзе выступіў намеснік прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Р. І. Коктыш. Думкамі аб задачах калектыву ў святле праекта ЦК КПСС падзяліліся старшыня прафбюро АГЧ С. С. Сапронаў, начальнік аддзела забеспячэння У. І. Тарасевіч, сакратар камсамольскай арганізацыі М. М. Вільчыцкі, начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва Л. І. Марыніч, в. а. начальніка гаража К. С. Капялевіч і іншыя.

Намеснік дырэктара студэнцкага гарадка М. Н. Асіпенка расказаў пра ўдзел універсітэцкіх інтэрнатаў у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе і прапанаваў узмацніць адказнасць студэнтаў за захаванасць сацыялістычнай маёмасці.

У ходзе абмеркавання праекта ўсе прысутныя з задавальненнем адзначылі клопат партыі аб далейшым сацыяльным прагрэсе грамадства і шырокую праграму павышэння народнага дабрабыту як галоўную задачу партыі ў васьмідзесятыя гады і вырашылі прыкласці ўсе сілы і стаpанне для яе паспяховага выканання.

С. КАСЯЧЭНКА,
сакратар партбюро АГЧ.

## Выкарыстоўваць штодзённа

НА ПАСЯДЖЭННІ кафедры навуковага камунізму, прысвечаным абмеркаванню праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда КПСС «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года», разгледжана пытанне аб выкарыстанні праекта ЦК КПСС у вучэбна-выхаваўчай рабоце.

У прынятым рашэнні вызначаны меры па шырокаму выкарыстанню гэтага важнага дакумента ў лекцыях, на семінарскіх занятках, у палітыка-выхаваўчых мерапрыемствах.

На гістарычным, філалагічным, хімічным і іншых факультэтах праект ЦК КПСС абмяркоўваўся на семінарскіх занятках па навуковаму камунізму. Студэнты праявілі вялікую цікавасць да тэмы семінараў і прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтага пертыйнага дакумента.

Калектыў кафедры ў час абмеркавання праекта ЦК КПСС вынес наступную прапанову: у пункце «У галіне грамадскіх навук сканцэнтраваць намаганні па наступных напрамках: абагульненне вопыту рэвалюцыйна-пераўтваральнай дзейнасці КПСС, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, распрацоўка праблем дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, палітычнай эканоміі на аснове выкарыстання матэрыялістычнай дыялектыкі ў вырашэнні тэарэтычных і практычных задач» пасля слоў «палітычнай эканоміі» дабавіць «і навуковага камунізму».

П. ДРОНЬ,
загадчык кафедры
навуковага камунізму.

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## Адраджэнне

«Мы вельмі рады, што вучымся ў СССР — на радзіме Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы шчыра ўдзячны Савецкаму ўраду і народу Краіны Саветаў за тую значную дапамогу, якую яны нам аказваюць...»

Юнак з Кампучыі Уч Тнонг Сенг хваляваўся, калі гаварыў гэтыя словы. Гаварыў не толькі ад сябе, але і ад імя сваіх таварышаў, што займаюцца на падрыхтоўчым аддзяленні БДУ імя У. І. Леніна. І калі мы глядзелі ў іх добрыя твары, то нават не хацелася думаць, што зусім нядаўна гэтым юнакам і дзяўчатам давялося спазнаць усе жахі рабскага жыцця, халодны подых смерці.

Не адзін год жыццё кампучыйскага народа было невыносна цяжкім пад ігам рэжыму Пол Пота — Іенг Сары. Людзі, нібы жывёла, былі сагнаны ў працоўныя камуны, жудасныя лагеры смерці. Працавалі без ежы, адзення, па васемнаццаць гадзін у суткі. Платай і ўзнагародай за гэта былі жорсткія пабоі і здзекі прыганятых.

У шасці кампучыйскіх студэнтаў, што займаюцца на падрыхтоўчым аддзяленні, загінулі не толькі родныя, але і сябры.

Дыктатарскі рэжым і чалавеканенавісніцкая палітыка кітайскіх гегеманістаў пакалечылі жыццё многіх тысяч кампучыйцаў. Уч Тнонг Сенг займаўся тады ў Пнампеньскім універсітэце.

— Аднойчы на тэрыторыю універсітэта ўварваліся салдаты, — расказвае ён.— Яны забілі ўсіх выкладчыкаў, разбурылі будынак універсітэта, а студэнтаў адправілі ў працоўныя лагеры. У нашай групе было 300 чалавек. Мы працавалі на палях і кожны дзень бачылі жорсткасць і смерць. Праз два гады з усёй групы ў жывых засталося толькі чатыры чалавекі.

У студзені 1979 года Кампучыя стала свабоднай. Мы ўдзячны мужнаму в'етнамскаму народу і народам усіх сацыялістычных краін за дапамогу, якую яны нам аказваюць. Савецкі Саюз — наша другая Радзіма, гаворыць Уч Тнонг Сенг.

Народная Рэспубліка Кампучыя стала на шлях эканамічнага і сацыяльнага адраджэння. У салідарнасці з Савецкім Саюзам і іншымі краінамі сацыялізму — гарантыя незалежнасці, будучых перамог.

**ЧАН НГОК ТХОНГ,**
**студэнт І курса**
**факультэта журналістыкі.**

# Універсітэцкаму дыплому—гарантыю якасці



Асістэнт Канстанцін Аляксандравіч ІВАНОЎ прымае экзамен па алгебры ў студэнткі І курса мехмата Аксаны ГАРАШЧУК.
Фота М. Дубовіка.

СЛОВА ВЫДАТНІКУ

## Шпаргалка не патрэбна

**СЕСІЯ для ўсіх без выключэння — адказны час праверкі ведаў. У студэнтак хімфака Наташы Пальчэўскай і Вольгі Максіменка ўжо мінулі дзве сесіі, а ў залікоўках — адны пяцёркі. Ім не перашкаджае добра вучыцца і значная грамадская работа, якой яны заняты.**

— Я ніколі не ставіла перад сабой такой мэты: вучыцца дзеля адзнакі,— гаворыць Оля Максіменка. — Проста заўсёды хацела пазнаць як мага больш цікавага і карыснага. А адзнака — гэта ўжо вынік тваёй работы.

— Але работы не за некалькі дзён да экзамена, — дадае Наташа,— а штодзённай, на працягу ўсяго семестра. Напрыклад, калі добра рыхтавацца да кожнага семінара па гісторыі КПСС, то напярэдадні сесіі застанецца толькі паўтарыць пройдзенае. Не апошнюю ролю адыгрывае і канспект, бо на лекцыі заўсёды можна пачуць цікавы сучасны матэрыял.

**— Што дапамагае ў вучобе больш усяго: здольнасць хутка засвойваць, запамінаць ці ўсё ж любоў да працы, уменне прымусіць сябе працаваць!**

— Напэўна, і тое, і другое,— лічыць Оля,— але галоўнае, вядома, праца. Якія б ні былі твае здольнасці, без пэўных намаганняў з твайго боку поспеху не будзе.

**— Ці хвалюешся перад сесіяй!**

— Нейкая няўпэўненасць заўсёды ёсць, — гаворыць Наташа Пальчэўская. — Вельмі баялася першай зімовай сесіі: незнаёмыя выкладчыкі, шмат новых прадметаў. А вясной было ўжо намнога лягчэй.

**— А ці бывае такое: бярэш білет і раптам адчуваеш, што ўсё забылася!**

— Здаралася, — прызнаецца Оля. — Дапамагло тое, што не разгубілася і ўзяла сябе ў рукі. Адразу паявілася ўпэўненасць.

— Наогул са мной такога не бывае. Думаю, што не трэба губляцца ў падобных сітуацыях. Перастанеш хвалявацца — і адразу ўсё ўспомніш, — гаворыць Наташа.

**— У апошні час сярод студэнтаў бытуе меркаванне, што шпаргалкі пісаць можна і нават патрэбна, але браць іх на экзамен не трэба. А вы як лічыце!**

— Чаму абавязкова шпаргалкі? Рыхтуючыся да экзамена, я часта раблю для сябе паметкі на лістках паперы: вывады формул, тэарэм. Але на экзамен іх, вядома, не бяру. Ніякай карысці гэта не прынясе,— лічыць Наташа.

А вось меркаванне Олі Максіменка:

— Шпаргалак ніколі не пісала. Спадзяюся толькі на свае веды.

**Інтэрв'ю правяла**
**Н. КРАПІВІНА,**
**студэнтка І курса**
**факультэта журналістыкі.**

## І «ДОБРА», І «ВЫДАТНА»

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ ЭЦЮД

ТАК УЖО ЗАГАДКАВА размешчаны пакоі ў геаграфічным корпусе, што аўдыторыі з парадкавымі лічбамі «51» і «52» знаходзяцца ў розных канцах трэцяга паверха. Аб'ядноўваюць жа іх сёння не толькі парадкавыя нумары, але і традыцыйныя натоўпы каля дзвярэй — другакурснікі і трэцякурснікі геафака здаюць чарговыя экзамены.

Зойдзем спачатку да старэйшых. Рука выкладчыка павольна выводзіць першую адзнаку на экзамене — «выдатна» ў залікоўцы Ганны Давыдзенка.

Табліцы, што размешчаны навокал, нагадваюць абстаноўку медыцынскай установы. На іх — схема нервовай сістэмы чалавека, будова галаўнога мозгу і г. д. Студэнты-географы здаюць экзамен па псіхалогіі.

Погляды Гіпакрата на тэмперамент раскрывае Ларыса Карніцкая. Бойка пералічвае тыпы тэмпераментаў, прыводзіць цікавыя прыклады. Вышэйшая адзнака.

Галя Лапато пасля змястоўнага адказу па білету атрымала цікавае дадатковае пытанне: як канкрэтна можна высветліць і развіць здольнасці дзіцяці? Каму, як не будучым педагогам, прыйдзецца вельмі хутка прымяняць на практыцы здабыткі сённяшняй тэорыі. Галя ўпэўнена справілася з дадатковым пытаннем. «Пяцёрка».

А вось Алена Гізоўская залішне хвалюецца ў час адказу. Хутка-хутка расказвае аб будове і функцыях нервовай тканкі. У спешцы — агаворваецца. Рэм Іосіфавіч Вадэйка, загадчык кафедры псіхалогіі, які прымае экзамен, вымушаны час ад часу перапытваць і ўдакладняць. Але адказвае Алена правільна.

Як перашкаджае хваляванне! Пры універсітэцкай кафедры псіхалогіі некалькі год працуе гуртох аутагеннай трэніроўкі. Найбольш актыўныя яго члены навучыліся ў час заняткаў валодаць сабой настолькі, што, як правіла, умеюць амаль зусім здымаць з сябе экзаменацыйнае хваляванне. Не хапае гэтага Алене. Але выкладчык-псіхолаг разумее нервовы стан студэнткі і правільна ацэньвае веды.

Крыху хвалявалася і Наташа Журко, апошняя з «першай пяцёркі». «Гонар факультэцкай гімнастыкі» — так ахарактарызавалі яе аднакурснікі. І спартыўны характар дзяўчыны праявіўся спаўна — пераадолела сябе. «Пяць» балаў!

— У вас заўсёды выдатнікі адказваюць першымі? — пытаюся ў аднакурснікаў Ані, Ларысы, Галіны, Алены і Наташы. І «фізгеографы», як сябе называюць студэнты гэтай групы, наперабой расказваюць, што дзяўчаты — «цвёрдыя харашысткі», але па склаўшайся традыцыі заўсёды ідуць на экзамен першымі.

«Першая пяцёрка» — на «выдатна»! Не такая ўжо рэдкая з'ява. Але факт гэты пасобаму бадзёра настройвае ўсю групу. Ды і выкладчыку, безумоўна, прыемна, хоць не вельмі ўдалыя адказы яшчэ наперадзе.

Другая аўдыторыя. Другі экзамен. Другая сістэма. Мікалай Пятровіч Хаміцкі, старшы выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі СССР, запрашае на свой экзамен па метэаралогіі і кліматалогіі чатырох студэнтаў. Акрамя тэарэтычных адказаў на пытанні білета, кожны павінен растлумачыць прынцып дзеяння адной з метэаралагічных прылад, якія расстаўлены на сталах. Мінулым летам сённяшнія другакурснікі праходзілі практыку па метэаралогіі на вучэбна-геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна», таму «практычныя» пытанні цяжкасцей не выклікаюць.

Адказы розныя. Змястоўныя і крыху няўпэўненыя, заблытаныя. Чаргуюцца адзнакі: Аляксандр Ражноўскі — «4», Наташа Іваненка — «5», Андрэй Андрэеў — «4». А вось і першы кандыдат на «тройку». Дзяўчыне, якая ніяк не можа справіцца з білетам, выкладчык дае магчымасць крыху падумаць. Цікава адказвае Сяргей Асіпкоў, але на «выдатна» не выцягнуў — «4».

Сяргей Карнейчык расказвае аб прынцыпе дзеяння геліографа. У руках студэнта — прылады для вымярэння працягласці сонечнага ззяння. На масіўным штатыве замацаваны празрысты шар, у якім, як у люстэрку, адлюстроўваюцца аўдыторыя, кліматычныя карты і твары географаў-другакурснікаў, якія яшчэ рыхтуюцца да адказу...

**Т. САХАШЧЫК.**

# ДЗЕЙСНАЯ ДАПАМОГА

ЛЕКЦЫЙНАЯ ПРАПАГАНДА

РАШЭННЕ чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС аб скліканні ў лютым 1981 года XXVI з'езда партыі знайшло жывы водгук у кожнага савецкага чалавека. Арганізацыя таварыства «Веды» Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, якая налічвае ў сваіх радах 970 членаў, актыўна ўключылася ў лекцыйную прапаганду па дастойнай сустрэчы чарговага з'езда — вялікай падзеі ў жыцці партыі і савецкага народа.

На пасяджэнні прэзідыума праўлення ў верасні быў абмеркаваны «Зварот членаў таварыства «Веды» Акадэміі навук БССР да вучоных, выкладчыкаў ВНУ, работнікаў навукова-даследчых устаноў горада-героя Мінска і рэспублікі» прыкласці максімум намаганняў і энергіі з тым, каб яшчэ больш актыўна і мэтанакіравана прапагандаваць марксісцка-ленінскае вучэнне, дасягненні перадавой навукі і тэхнікі, вялікія творчыя планы КПСС і тым самым аказаць усямерную дапамогу партыйным арганізацыям у камуністычным выхаванні працоўных, у паспяховым выкананні імі ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў. У адказ на гэты зварот прэзідыумам распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС. У іх прадугледжана забеспячэнне актыўнага ўдзелу ў лекцыйнай прапагандзе ўсіх членаў таварыства «Веды» БДУ.

Прэзідыум праўлення таварыства «Веды» БДУ абавязаў кожную пярвічную арганізацыю, а іх усяго 15, правесці ў працоўных калектывах, школах, студэнцкіх аўдыторыях не менш двух цыклаў лекцый па праблемах «Унутраная і знешняя палітыка», «Эканамічная палітыка партыі на сучасным этапе», «Савецкі лад жыцця» і г. д. Неабходна адзначыць, што гэта абавязацельства выконваецца. Так, лектары кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў (загадчык кафедры дацэнт М. І. Базылеў) чытаюць цыкл лекцый «Эканамічная палітыка партыі на сучасным этапе» ў Гродна. Лектары кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму (в. а. загадчыка кафедры дацэнт А. А. Круглоў) вядуць кіналекторый «Мараль, этыка і XX стагоддзе» для старшакласнікаў у Доме культуры Мінскага аўтазавода. Члены таварыства «Веды» кафедры навуковага камунізму (загадчык кафедры дацэнт П. П. Дронь) чытаюць цыкл лекцый «Савецкі лад жыцця» ў Жодзіна.

У мерапрыемствах запланавана таксама правесці 25 калектыўных выездаў вучоных на падшэфныя прадпрыемствы, у калгасы, саўгасы, школы; не менш 20 навукова-тэарэтычных і навукова-практычных канферэнцый. У выкананні гэтых форм прапаганды вялікую актыўнасць праяўляюць філалагічны факультэт, кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў, педагогікі.

Для студэнтаў універсітэта на кожным факультэце праводзіцца лекторый, у якім чытаюцца лекцыі на самыя розныя тэмы, а таксама праводзіцца цыкл лекцый «Ад з'езда да з'езда — ленінскім курсам». Гэты цыкл паспяхова чытаецца для замежных студэнтаў на падрыхтоўчым факультэце. У актавай зале універсітэта для супрацоўнікаў і студэнтаў праводзяцца грамадска-палітычныя чытанні. Ужо прайшлі дзве лекцыі. Чыталі лектары з Масквы А. І. Дзёмін і В. В. Вахрушаў. У студэнцкіх інтэрнатах праводзяцца вечары пытанняў і адказаў, сустрэчы з цікавымі людзьмі нашага горада, гутаркі.

Прэзідыум праўлення абавязаў кожную пярвічную арганізацыю распрацаваць новую тэматыку лекцый з тым, каб у 1981 годзе выдаць тэматычны зборнік лекцый, якія чыталіся членамі таварыства «Веды» Белдзяржуніверсітэта.

З каштоўнай ініцыятывай выступілі лектары кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму. Яны прапанавалі правесці ў інтэрнатах і на факультэтах вечары пытанняў і адказаў на тэмы маралі, эстэтыкі, атэізму. Відавочна, факультэцкія пярвічныя арганізацыі з прыемнасцю выкарыстаюць гэту добрую прапанову.

У арганізацыі таварыства «Веды» БДУ назапашаны багаты вопыт лекцыйнай работы, склаліся дзейсныя формы і метады прапаганды. Яна мае вялікі актыў лектарскіх кадраў: гэта прафесары Г. П. Давыдзюк, А. А. Галаўко, У. М. Сікорскі, Д. П. Жмуроўскі, Ю. С. Багданаў, дацэнты А. А. Круглоў, І. Ф. Рэкуц, Ф. І. Мельнік, Р. І. Вадэйка, І. Д. Стадуб, І. Ф. Рамаўскі, Ю. А. Гусеў, В. І. Гамаў, А. І. Ляўко, М. Б. Яфімава, П. М. Савасцёнак, М. З. Яноўскі, старшы выкладчык М. Я. Зайцаў і многія іншыя.

Можна выказаць упэўненасць у тым, што ўсе лектары універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» будуць яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у прапагандзе марксісцка-ленінскай тэорыі.

**Л. КЛЯУС,**
**адказны сакратар**
**арганізацыі таварыства**
**«Веды» БДУ**
**імя У. І. Леніна.**

# НА ЎЗДЫМЕ

30-я ГАДЫ ў жыцці камсамольскай арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта неслі ў сабе небывалы размах грамадскай актыўнасці, узлёт апантанасці і мэтанакіраванасці ўперад, уздым масавага патрыятызму, пачуцця злучанасці лёсу кожнага з лёсам Радзімы.

Гэта былі гады рашучай барацьбы за сацыялізм, гады, поўныя штурмавога пафасу першых пяцігодак, арганічнага спалучэння задач камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі з надзённымі задачамі будаўніцтва новага жыцця і новага грамадства. У студэнцкія аўдыторыі прыходзілі новыя пакаленні юнакоў і дзяўчат, якія глыбока пазналі тыя бязмежныя магчымасці для вучобы, якія адкрыліся перад імі.

Пленум ЦК ВЛКСМ у лістападзе 1932 года «Аб практычных мерапрыемствах камсамола па рэалізацыі рашэнняў партыі і ўрада аб вышэйшай школе» накіраваў камсамольскія арганізацыі на неабходнасць сканцэнтраваць увагу на вучобе студэнтаў. Кожны студэнт павінен быў весці канспект лекцый, практычных і лабараторных заняткаў. Уводзіліся пералікі абавязковай літаратуры (так званы мінімум), а таксама дадатковай (максімум) па кожнай спецыяльнасці. Камсамольцы ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні кантролю за якасцю чытаемых курсаў, за наведваннем лекцый студэнтамі. У інтэрнатах, бібліятэках, кабінетах — усюды адчуваўся ўдзел камсамольцаў у арганізацыі самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў. Барацьба за веды набыла масавы характар.

Вучоба станавілася адным з галоўных паказчыкаў у рабоце камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Вынікі далі адчуць сябе адразу. Калі яшчэ ў 1927-28 навучальным годзе паспяховасць студэнтаў універсітэта складала 80 працэнтаў, то ў 1928-29 навучальным годзе яна павысілася да 93,2 працэнта. Справаздачна-выбарны сход у кастрычніку 1929 года падвёў вынікі акадэмпаходу, адзначыў работу агульнауніверсітэцкай камісіі па кіраўніцтву паходам і прапанаваў яе працягваць.

Яшчэ большы размах атрымала дзейнасць камсамольскай арганізацыі па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ходзе сацыялістычнага спаборніцтва, якое разгарнулася ў ВНУ з 1929-30 навучальнага года і праходзіла ў некалькі этапаў, ахапіўшы ўсе напрамкі дзейнасці.

Камсамольская арганізацыя Белдзяржуніверсітэта заключыла дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве з камсамольскай арганізацыяй Мінскага педінстытута. У канцы 1929 года быў падпісаны дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве паміж камсамольскай арганізацыяй Беларускага дзяржаўнага універсітэта і камсамольскай арганізацыяй Кіеўскага інстытута народнай гаспадаркі, а таксама Мінскага медінстытута.

Камсамольцы спаборнічалі за далейшае пашырэнне грамадска-палітычнай актыўнасці, за зніжэнне колькасці прагулаў і спазненняў, за «выхад» студэнтаў на фабрыкі, заводы, у калгасы. Наладжваліся агляды-выстаўкі лепшых канспектаў. Камсамольскія арганізацыі факультэтаў выклікалі на сацспаборніцтва калектывы будоўляў, заводаў, фабрык. Арганізоўваліся агляды, конкурсы, канферэнцыі.

Камсамольцы ўдзельнічалі ў выбарных кампаніях, шырока арганізоўвалі палітычную адукацыю моладзі, разгортвалі інтэрнацыянальнае выхаванне студэнтаў, праводзілі вялікую шэфскую і культурна-масавую работу, дапамагалі ліквідоўваць непісьменнасць. Гераічны час выхоўваў сапраўдных патрыётаў.

«На прыкладзе папанінцаў мы будзем вучыцца, як трэба весці барацьбу з цяжкасцямі, як трэба выконваць даручэнні партыі і ўрада» — так гучала заява студэнтаў ва універсітэцкай шматтыражцы «За ленінскія кадры». Ударныя брыгады ствараліся студэнтамі ў кожнай акадэмічнай групе, дзе яны імкнуліся па-ўдарнаму працаваць і вучыцца. Свае спартыўныя святы, пераходы яны прысвячалі гераіням-лётчыцам, а таксама называлі маршруты, мерапрыемствы імёнамі слаўных сыноў і дачок савецкага народа. Быў арганізаваны спартыўны пераход імя М. Расковай.

Асабліва моцная дружба завязалася ў камсамоліі старэйшай ВНУ рэспублікі з балтыйскімі маракамі лінкора «Парыжская камуна». Аб гэтым сведчаць пісьмы да маракоў і пасланні маракоў-чырванафлотцаў у Мінск.

Камсамольская арганізацыя БДУ і маракі абменьваліся дэлегацыямі ў дні ўсенародных святкаванняў, дзяліліся вопытам камсамольскай работы, расказвалі адзін аднаму аб справах і вучобе. Гэта была моцная, сапраўдная дружба, якая нарадзілася ў суровы і цяжкі час. Студэнты запісваліся ў аэраклубы, гурткі, рыхтаваліся стаць на абарону Радзімы.

Ужо ў 1937 годзе сярод студэнтаў універсітэта 444 чалавекі насілі высокае званне варашылаўскага стралка I ступені, 16 — варашылаўскага стралка II ступені, 25 чалавек закончылі планерную школу; у сценах універсітэта было падрыхтавана 183 інструктары супрацьпаветранай хімічнай абароны.

Паказчыкі раслі з году ў год. Так, у Белдзяржуніверсітэце ў 1938-39 навучальным годзе налічвалася 700 варашылаўскіх стралкоў, 15 майстроў стралковага спорту, 22 варашылаўскія коннікі, 70 вадзіцеляў аўтамашын, 123 матацыклісты.

Лепшых вынікаў у індывідуальным сацыялістычным спаборніцтве па абароннай рабоце дасягнуў студэнт III курса хімфака Георгій Фалевіч, які здаў нормы на 8 абаронных значкоў.

Абаронна-масавая работа, якая праводзілася ва універсітэцкіх сценах, адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы студэнцкай моладзі да службы ў радах Чырвонай Арміі, да абароны Радзімы.

У пачатку 1941 года 10 камсамольцаў пачалі лыжны прабег імя XVIII партыйнай канферэнцыі па маршруту Мінск — Баранавічы. Камітэт ЛКСМБ паставіў задачу перад удзельнікамі прабегу: праверыць вынослівасць спартсменаў ва ўмовах працяглага пераходу. У мароз, сцюжу не перарываўся паход. 10 камсамольцаў-смельчакоў прыйшлі да намечанай мэты.

Праводзілася вялікая работа па працоўнаму выхаванню. Студэнты аказвалі дапамогу сялянам у вядзенні калектыўнай гаспадаркі, збіралі ўгнаенні, арганізоўвалі «паходы за ўраджай». Камсамольская арганізацыя ганарылася тым, што побач з рабочымі і калгаснікамі ў адзіным страі ішоў да новага жыцця, дапамагаючы на справе здзяйсненню велічнага перавароту ў вёсцы, як адзначалася ў пратаколах бюро ячэйкі ЛКСМБ універсітэта, «і камсамолец, спецыяльна накіраваны ў вёску для работы па падрыхтоўцы арганізацыі калгаса». У падшэфным Грычынскім сельскім савеце Чэрвеньскага раёна студэнты арганізавалі для жыхароў вёсак 2-тыднёвыя агранамічныя курсы.

Студэнты актыўна ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці. У 1939 годзе ў Белдзяржуніверсітэце працавала 6 гурткоў мастацкай самадзейнасці, у якіх займалася 150 студэнтаў.

Выступленні танцораў адзначаліся Ганаровай граматай на III Усебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці. Славіўся домравы аркестр. Калектыў яго ўдзельнічаў у конкурсах, выступаў на рэспубліканскім радыё. Карыстаўся папулярнасцю ў студэнтаў джаз-аркестр, у састаў якога ўваходзіла 13 чалавек.

Рос аўтарытэт камсамольскай арганізацыі. У 1930 годзе камсамольская арганізацыя універсітэта налічвала ў сваіх радах 622 камсамольцы. У асноўным гэта былі камсамольцы ленінскага закліку, якія ўступілі ў ВЛКСМ у 1924—26 гадах. За дзесяць перадваенных год была прыведзена ў парадак структура камсамольскай арганізацыі. Вялікае значэнне ва ўмацаванні дысцыпліны адыграў абмен камсамольскіх дакументаў. Гэта быў агляд сіл Ленінскага камсамола, яркая дэманстрацыя яго згуртаванасці вакол Камуністычнай партыі, маналітнасці і адданасці агульнай справе, вернасці ідэалам камунізму.

Наступаў час вялікіх выпрабаванняў. Над Еўропай чырванела зарыва вайны. Наступалі гады іншай вучобы. Даводзілася спасцігаць новую навуку — навуку нянавісці да ворага. Напярэдадні ў студэнтаў універсітэта былі самыя цяжкія залікова-экзаменацыйныя сесіі.

**Ул. НАВУМОВІЧ,**
**кандыдат філалагічных навук, сакратар камітэта камсамола БДУ (1973—1975 гг.).**

# ЛЕТАПІС СТАНАЎЛЕННЯ

**Паважаны чытач! З гэтага нумара мы пачынаем друкаваць летапіс БДУ імя У. І. Леніна, які падрыхтаваў да друку дацэнт А. І. КАЖУШКОЎ.**

**1918 ГОД**

Петраградскае аддзяленне Беларускага нацыянальнага камісарыята ўзбудзіла хадайніцтва перад Наркамасветы РСФСР аб замацаванні за Беларусіяй Юр'еўскага універсітэта і аб пераводзе яго часова ў адзін з неакупіраваных гарадоў — Віцебск або Смаленск.

**1919 ГОД**

**21 студзеня**

У. І. Ленін падпісаў дэкрэт Саўнаркома РСФСР аб заснаванні дзяржаўных універсітэтаў у Кастраме, Смаленску, Астрахані і Тамбове і аб пераўтварэнні ў дзяржаўныя універсітэты былых Дзямідаўскага юрыдычнага ліцэя ў Яраслаўлі і Педагагічнага інстытута ў Самары «ў азнамяванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года...»

**Люты**

Па прапанове ЦВК Саветаў у Маскве пры Наркамасветы РСФСР створана камісія садзейнічання па адкрыццю універсітэта ў Мінску.

**Люты**

У Мінску пры губернскім камісарыяце народнай асветы створана камісія з 8 чалавек па арганізацыі універсітэта пад старшынствам акадэміка Я. Ф. Карскага.

**25 лютага**

Прынята пастанова ЦВК Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Беларусі аб адкрыцці ў Мінску Дзяржаўнага універсітэта і асігнаванні на першыя патрэбы па яго арганізацыі 1 мільёна рублёў.

**1920 ГОД**

**13—17 снежня**

II Усебеларускі з'езд Саветаў прызнаў неабходным хутчэйшае стварэнне універсітэта ў Мінску.

**1921 ГОД**

**18 красавіка**

Прэзідыум ЦВК Саветаў Беларусі прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў саставе факультэтаў: рабочага, грамадскіх навук, медыцынскага, сельскагаспадарчага і фізіка-матэматычнага.

**17 чэрвеня**

Пачаліся заняткі на рабочым факультэце. Да заняткаў прыступіла 160 чалавек.

**9 ліпеня**

Пастановай калегіі Наркамасветы БССР зацверджана праўленне універсітэта. Рэктарам зацверджаны прафесар У. І. Пічэта.

**11 ліпеня**

У Дзяржтэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае абвяшчэнню БДУ. Удзельнікі пасяджэння накіравалі прывітальную тэлеграму У. І. Леніну.

**30 кастрычніка**

Урачысты сход, прысвечаны адкрыццю універсітэта. На сходзе прысутнічалі В. Г. Кнорын, А. Г. Чарвякоў.

**31 снежня**

Створана партыйная ячэйка універсітэта.

**1922 ГОД**

**1 студзеня**

Створана камсамольская ячэйка універсітэта.

**25 лютага**

Адбыўся арганізацыйны сход навуковага таварыства універсітэта. Створаны 4 секцыі: краязнаўства, фізіка-матэматычных, тэхніка-эканамічных і грамадскіх навук.

**11 ліпеня**

Удзельнікі ўрачыстага сходу, прысвечанага першай гадавіне Беларускага дзяржаўнага універсітэта, накіравалі прывітальную тэлеграму У. І. Леніну.

# ЗАПРАШАЕ «ГАУДЭАМУС»

СТУДЭНЦКАЕ КАФЭ АДКРЫЛАСЯ.

Прарэктар В. Г. Ціхіня і сакратар парткома М. Г. Елісееў ва ўрачыстай абстаноўцы пераразаюць каляровую стужку. Гучыць бадзёры марш, і госці, і першыя наведвальнікі кафэ падымаюцца па прыступках лесвіцы.

Кафэ — гэта новая форма арганізаванага адпачынку студэнтаў. Створаны 6 секцый, якія будуць працаваць па чарзе кожны дзень тыдня. Вось яны: турыстычная, літаратурная, харэаграфічная, слайд-секцыя, інтэрнацыянальнай работы, дыскатэка. Само сабой зразумела, што функцыяніраваць на поўную моц без актыўнай падтрымкі і ўдзелу студэнтаў універсітэта гэтым секцыям будзе нялёгка. Яны і разлічаны на ўдзел у іх шырокага студэнцкага актыву. Кафэ поўнасцю належыць студэнтам. Яны яго гаспадары. І менавіта ад іх у многім залежыць, ці будзе тут цікава і карысна адпачываць.



Адміністрацыя і будаўнікі кафэ паклапаціліся, каб наведвальнікі адчувалі сябе ўтульна. Мяккія крэслы, прыгожыя шторы, стылізаваны пад старыну інтэр'ер і свяцільнікі адразу ж ствараюць добры настрой. Дарэчы зазначыць, што кіраўнікамі ўсіх секцый з'яўляюцца студэнты. Яны самі складаюць адпаведныя праграмы выступленняў. І трэба сказаць, някепска. У гэтым можна было ўпэўніцца на адкрыцці кафэ. Кіраўнік кожнай секцыі коратка расказаў аб перспектывах работы. Былі паказаны асобныя нумары праграм. Асабліва да спадобы гледачам прыйшлося выступленне харэаграфічнай групы «Арніка», выкананне песень удзельнікамі турыстычнай секцыі, дэманстрацыя слайдаў.

**М. ДУБОВІК.**
Фота аўтара.

● МАРЫ ПЯЦІКУРСНІКА

# РАБОТА—СВЯТА

ЗАКАНЧВАЮ інстытут — мне работа патрэбна. Каб ніякіх перагрузак, крайнасцей. Па душы, адным словам.

Раніцай паднялі гадзін у дзесяць — і ўперад. Праз дарогу, пешшу — мінуты тры. А там ўжо чакаюць. Там ужо сустракаюць. Лентачка ля ўваходу, нажніцы на падушцы. Кветкі, аркестр струнны, шампанскае. Іван Сідаравіч сам прысутнічае. Руку цісне, у вочы заглядвае. Юпітэры, кінакамеры. Волечка з суседняга аддзела, цэха, брыгады, звяна ў шчочку чмокае, у левую. У правую мясцком, прафком. Харалы, фугі, санеты.

Урачысты мітынг. Прамовы, прывітанні, тосты, спічы. Апладысменты. Тэатралізаванае прадстаўленне, танцы, дыскатэка.

Урачыстыя провады на рабочае месца. Усе падбадзёрваюць, даюць парады, жартуюць, падтрымліваюць. Хто за локці, хто за лацканы.

Падарункі, сувеніры, значкі, паштоўкі, манеты. Аўтографы просяць, як у кіназоркі.

А я ні-ні. Не чую і не бачу. Усё толькі пісьмова. У трох экземплярах. На спецыяльных бланках. З гербавай пячаткай. Праз тры інтэрвалы і сакратаршу.

Кабінет, гараж, кватэра.

Чыста, стэрыльна, ізнізавана.

Збоку паддуў, зверху падсвет. Злева баржомі, квас, чай з лімонам. Сервізы, падстаканнікі, чайнікі, кофемолкі. Справа бальзам, каньяк, настойкі. На травах. У вуглу — 69 па дыяганалі, каляровы, японскі. У другім — шафа. Незгараемая, браніраваная, з сігналізацыяй. На вокнах ліаны, квітнеючыя кактусы, рададэндраны. Птушкі, папугаі, змеі за шклом. Гербарыі, акварыумы, аранжарэі. На падлозе дываны, шкуры. Пад рукамі кнопкі, рычагі, тумблеры. Павярнуў, падзьмуў, шчоўкнуў, таўкнуў — усё на месцы. Усё зроблена. Усе справы перароблены, перасланы, падшыты, падклеены, зарэгістраваны. Выдатна! Прыгажосць! А ў канцы месяца ўсё як трэба — і квартальныя, і прэміяльныя... Ніхто не зайздросціць. Ніхто не плятканічае. Усім усё падабаецца. Праз тыдзень у першыя намеснікі, праз месяц у галоўныя, праз год у генеральныя. А там і далей...

Вось гэта да! Вось гэта работа! Якраз! Без ніякіх крайнасцей, ніякіх перагрузак. Не работа — а свята. Як прыйшоў, так і знайшоў. Па душы, адным словам!




● ДЭТЭКТЫЎ

# Нялёгкая служба

— Стой! Папаўся! Дахадзіўся! Дазваніўся! Абшукаць!

— У левай кішэні пінжака залікоўка.

— Так, далей.

— У правай — насоўка, некалькі шпор.

— Да экзамена, значыцца, рыхтуемся. Так, Працягвайце.

— Ва ўнутранай кішэні пінжака студэнцкі білет. У ім рубель.

— Што яшчэ?

— Нічога.

— Шукайце!

— Правы пусты. У левым знайшлі штрафны талончык.

— «Заяц»?! Добранька. Важная ўліка. Працягвайце дагляд. Адкрыйце партфель. Перакуліце. Ніякіх бутэлек? Няхай праходзіць. Але каб больш не трапляўся!

Студэнт сабраў свае рэчы і, вінавата азіраючыся, праціснуўся наперад, паміж дружыннікамі і вахцёрам, якія стаялі ў той суботні вечар ля інтэрнатаўскай прахадной.

● ДЫЯЛОГІ

# РОГІ

— СЯРГЕЙ ІВАНАВІЧ, дзень добры!

— Ну?

— Я кажу, дзень добры, Сяргей Іванавіч!

— Ну і што ты мне хочаш гэтым сказаць, Стогаў?

— Сяргей Іванавіч, вы, канешне, прабачце, што адрываю вас ад важных спраў... Я вось тут хацеў прэзентаваць адну цікавую паштоўку. Ведаю, што ў вас гэта хобі... Дай, думаю, парадую...

— Ну што ж, Стогаў, дзякуй, дзякуй. Гэта сапраўды рэдкая рэч — 11-годдзе Бірулінскага трэста сталовых і рэстаранаў. Мне яна вельмі падабаецца. Такой паштоўкі ні ў кога няма.

— Сяргей Іванавіч, вы мне прабачце, што зноў адрываю.

— Справы пачакаюць, Стогаў. Я заўсёды рад паразмаўляць са студэнтамі, бо сам калісьці быў такім, ведаю...

— Сяргей Іванавіч, вось гляджу я на вас і думаю — вы ўвесь час нешта пішаце і пішаце. А я што? Я так... Вось я і вырашыў, што гэта шарыкавая шматкаляровая ручка вам больш патрэбна, чым мне. Націсніце вось на гэтую кнопачку. Вось так. Бачыце? Чырвоненькі колер. Яшчэ раз націсніце — зараз сіненькі. Яшчэ раз — зялёненькі. А яшчэ — жоўценькі.

— Вось за гэта табе, Стогаў, падкрэсліваю, вялікае дзякуй. Ты неяк адразу зразумеў, малайчына!

— Сяргей Іванавіч, а, Сяргей Іванавіч! Вы прабачце, што... можа, я ўжо вам надакучыў, дык...

— Ніякіх «надакучыў», Стогаў! Давай! Давай і яшчэ раз давай. Раз трэба, значыць, трэба, я — на рабоце.

— Даю, Сяргей Іванавіч, зараз жа даю... Дазвольце, Сяргей Іванавіч, вам вельмі такі просценькі, але ў той жа час арыгінальны сувенір уручыць. Адзін знаёмы з тундры прыслаў. Гэта — рогі. Мне яны навошта, а вам... Вам — іншая справа. Можна ў кватэры павесіць, ля ўваходу альбо ў зале, дзе ваша жонка глядзіць тэлевізар. Няхай усе бачаць, што ў вас ёсць рогі.

— Ну, Стогаў! Ну, Стогаў! Не чакаў. Прама здзівіў мяне. А ўчора на заліку думаў інакш. Тры разы білет цягнуў — і нічога. А сёння проста малайчына. Выдатна. Залікоўка пры сабе?

— А як жа!

— Ну, тады давай сваю залікоўку!

# СЕРВІС

ПАРАДЫ ТЫМ, ХТО КАРЫСТАЕЦЦА ПАСЛУГАМІ ГРАМАДСКАГА ТРАНСПАРТУ:

— уваходзячы ў трамвай, аўтобус ці тралейбус, неабходна адразу ўзяць білет. Яго можна ўзяць у пасажыраў, якія выходзяць;

— не чытайце ў грамадскім транспарце. Гэтым вы ставіце ў няёмкае становішча пасажыраў, якім прыйдзецца выгібацца, цягнуць шыі, трымаць акуляры;

— калі ў трамвай, аўтобус ці тралейбус зайшла бабуля, не спяшайцеся ўступіць ёй месца. Можа здарыцца так, што побач з вамі сядзіць чалавек, больш культурны за вас;

— не рэкамендуецца таксама ў грамадскім транспарце перавозіць імпартныя рэчы, мэблю і гэтак далей, бо надакучыць адказваць кожнаму на пытанне: «Дзе дасталі?»

— калі ў трамваі, аўтобусе ці тралейбусе апынуўся злодзей ды яшчэ ў нецвярозым стане, то адразу пасадзіце яго на месца.

Прыемнага падарожжа!



Цэйтнот...

● АМБУЛАТОРЫЙ ЛІФТа

# НІКАЦІН—ЯД!

ПРАГРАМІСТ Фёдар Іваноў стаў у чаргу. Акуратна стаў, за апошнім. Праз 47 мінут 30 секунд ён узяў білет на пасажырскі поезд Мінск — Гомель і, ласкава адпіхнуўшы вярзілу ў пыжыкавай шапцы, пайшоў у залу чакання.

Праз тры гадзіны 42 мінуты ён ужо садзіўся ў поезд, прапускаючы шматлікіх жанчын з дзецьмі і бабулек з мяшкамі.

Роўна праз 32 мінуты ён рашыў выкурыць цыгарэту — трэцюю, запланаваную на гэты дзень. Фёдар выйшаў у тамбур, у той самы тамбур, дзе можна курыць, і прыкурыў ад запалкі.

Зацягнуў, пашукаў месца, куды можна скінуць попел, і не знайшоў. «Скінуць на падлогу? Дрэнна. Дзверы зачынены... Адчыніць?.. Дрэнна!» — думаў Іваноў. «Чыста не там, дзе падмятаюць, чыста там, дзе не насмечваюць!» — прачытаў ён шыльдачку і ўмомант усё вырашыў для сябе — падышоў да «стоп-крана».

...Калі вагон адчынілі, Іваноў выкінуў «бычок», здзьмуў з далоняў попел і пераканаўча сказаў:

— Я гатовы панесці заслужанае пакаранне.

# ХРОНІКА

**НАВІНКА**

ДРУГАКУРСНІК Іван Бобрыкаў сканструяваў электронны прыбор «Экзамен». У той момант, калі ён цягне білет, на табло прыбора ўспыхвае адзнака яго ведаў.

**РЭКОРД**

КАНДЫДАТ у майстры спорту па дэльтапланерызму К. Тухаў пражыў без стыпендыі тры з палавінай гады. Гэта амаль на паўгода перавышае рэкорд першаразраднікa па бабслею Б. Розава, які ўжо закончыў інстытут.

**ПАСЛУГА**

ПА ШМАТЛІКІХ пажаданнях студэнтаў у інтэрнатах адкрываецца бюро маленькіх непрыемнасцей. Тыя, хто незадаволены спакойным студэнцкім жыццём, заўсёды маюць магчымасць атрымаць паслугу ў тым ці іншым выглядзе. Адключэнне вады на суткі каштуе 40 капеек, электрычнасці — 20 капеек, каналізацыі — 1 рубель 12 капеек. Аплата тэрміновых і доўгатэрміновых паслуг — па дагаворанасці.

**ВУНДЭРКІНД**

У СЁМАЙ ГРУПЕ другога курса ёсць незвычайны студэнт. Ён не ўдзельнічае ў хоры, не з'яўляецца членам дружыны, не запісаны ў гуртні, не ўваходзіць у састаў рэдкалегіі насценнай газеты, не сустракаецца з дзяўчынай. Ён акуратна ходзіць на лекцыі.

**АЎТАМАТЫКА**

У ПРЫЛАЎСКІМ канструктарскім бюро распрацавана новая мадэль ліфтоў для студэнцкіх інтэрнатаў. У выпадку паломкі ліфта ўключаецца зблакіраваны з ім сігнал выкліку спецыяльнага чалавека, які дапаможа дабрацца вам да свайго пакоя.

**ЦІКАВУЮ ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ**

прыкмеціла студэнтка С. Божкава. «Калі на вуліцы сцюжа,— гаворыць яна,— батарэі ў інтэрнаце ледзь цёплыя. А як толькі прыгрэе сонейка, адразу падымаецца тэмпература батарэй».

**У СВЕЦЕ МАСТАЦТВАЎ**

НА НОВУЮ ФОРМУ абслугоўвання студэнтаў перайшоў нядаўна спецыялізаваны пункт па прыёму утыльсыравіны. Зараз, каб атрымаць дэфіцытную кнігу, трэба здаць не менш чым 20.




# МАТЧ

УЧОРА ВЕЧАРАМ, пасля сямі дадатковых таймаў, трынаццаці булітаў і дваццаці чатырох удаленняў, закончыўся фінальны матч па хакею паміж студэнцкімі камандамі «Рэха» і «Бумеранг». Пераможца не вызначыўся — 132:132. Сваімі поглядамі, разважаннямі, меркаваннямі і назіраннямі падзяліўся за стаканам кефіру трэнер «Бумеранга» Віктар Кум:

**Пытанне: Як гульня?**

Адказ: Нічога. Гульня як гульня, а як вам?

**Пытанне: Таксама. А што яшчэ?**

Адказ: Я думаю, што пры належных умовах (святло, інвентар, настрой, спадарожны брыз, павышаная стыпендыя, вольнае наведванне лекцый, паменшаная колькасць экзаменаў і залікаў) мы абавязкова перамаглі б.

**Пытанне: Ваша думка аб спартыўнай форме саперніка?**

Адказ: Прыгожая форма, сучасная. На асобных членах каманды глядзіцца проста выключна. Асабліва запомніўся колер нумароў і шлемаў.

**Пытанне: А варатар?**

Адказ: Галкіпер на месцы. На сваім.

**Пытанне: І апошняе — планы. На будучае?**

Адказ: Самыя розныя.

— Дзякуй.

— І вам таксама.




1. Магу зняць камень з сэрца.
2. Вазьму грэх на душу.
3. Мяняю, мяняў і буду мяняць.
4. Здам палітэканомію.
5. Даю аб'явы.

Над ЛІФТом працавалі: А. ВАЎЧОНАК («Аб'явы», «Нікацін — яд!»), Л. ВІСОЎСКІ («Сервіс», «Нялёгкая служба»), П. ЛАГІ («Рогі», «Хроніка»). На сумленні дзяжурнага ліфцёра С. ЛЫСКАЎЦА — «Работа — свята», «Матч».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 студзеня 1981 г.

АТ 02057 Заказ 187.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ